# ФАРМІРАВАННЕ ЭСТЭТЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ ПРЫРОДЫ ЎДЗЕЛЬНІКАМІ АМАТАРСКАГА ФАЛЬКЛОРНАГА КАЛЕКТЫВУ

**Н. ПЕТУХОВА,**
аспірантка кафедры педагогікі СКД Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў,
навуковы кіраўнік:
**Я. Д. ГРЫГАРОВІЧ,**
доктар педагагічных навук, прафесар

Методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды з'яўляецца вынікам творчай і педагагічнай дзейнасці аўтара як хормайстра фальклорнага тэатра «Госьціца» і настаўніка па класу народных спеваў сярэдняй школы № 121 (фальклорны гурт «Жбанок»). Першы этап педагагічнай работы быў накіраваны на стварэнне эфектыўнай сістэмы выхавання, якая забяспечвала б высокую якасць эмацыянальнага і эстэтычнага далучэння дзяцей да традыцыйнай культуры на падставе этнакультурнага выхавання і паслядоўнага засваення лакальна-песеннай традыцыі.

У дзіцячым фальклорным калектыве «Сунічкі» (мастацкі кіраўнік А. А. Захарына) цэнтра пазашкольнай работы «Кантакт» Цэнтральнага раёна г. Мінска ажыццяўляецца апрабацыя методыкі.

На этапе фарміруючага эксперыменту мэтай нашай працы з'яўляецца ўдакладненне шляхоў развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды ў падлеткаў, удзельнікаў аматарскага фальклорнага калектыву «Сунічкі». Мы вызначылі наступныя шляхі ўдасканалення дзейнасці калектыву: а) фарміраванне эстэтычнага ўспрымання прыроды ўдзельнікамі фальклорнага калектыву ў працэсе этнакультурнага выхавання; б) уключэнне ў змест выхаваўчай дзейнасці канкрэтных этнічных ведаў па эстэтычным светаўспрыманні нашых продкаў.

У працэсе працы фальклорнага калектыву неабходна вырашыць наступныя задачы:

*адукацыйныя:* знаёмства з міфалагічнымі і эстэтычнымі ўяўленнямі нашых продкаў, абрадавай і святочнай культурай Беларусі; пашырэнне ўяўленняў аб асноўных фальклорных паняццях (тэзаўрус народнай культуры), складаючых эстэтычны кампанент народнага мастацтва; вывучэнне шматлікіх жанраў народных песень; фарміраванне ўменне «пераймаць» песню ад носьбітаў традыцыі;

*развіваючыя:* пастаноўка голасу і развіццё музычнага слыху, музычнай памяці і мыслення; фарміраванне эстэтычнага густу і інтарэса да традыцыйнай культуры;

*выхаваўчыя:* развіццё эстэтычных пачуццяў да прыроды; фарміраванне пачуцця прыналежнасці да роднага краю, яго гісторыі, культуры і мовы, гуманістычных норм жыцця і ідэалаў.

На наш погляд, методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ўдзельнікамі аматарскага фальклорнага калектыву з'яўляецца ўніверсальнай і можа паспяхова выкарыстоўвацца ў межах працы па этнакультурным выхаванні ў любым фальклорным калектыве.

Этнакультурнае выхаванне ўяўляе сабой сукупнасць розных відаў дзейнасці. Працэс этнакультурнага выхавання даволі грунтоўна даследаваны спецыялістамі (у тым ліку і ў галіне педагогікі), якія адзначаюць яго асноўныя напрамкі: пазнавальная, выканальніцкая, мастацка-практычная, сацыяльна-культурная дзейнасць [3; 4; 5]. З пералічаных вышэй відаў дзейнасці асноўнай з'яўляецца пазнавальная, якая забяспечвае ўсебаковую, паступовую падрыхтоўку дзяцей да ўключэння ў выканальніцкую, мастацка-практычную, сацыяльна-культурную дзейнасць. На рэпетыцыях дзеці спачатку тэарэтычна, а потым практычна знаёмяцца з абрадавай і святочнай культурай Беларусі і вучацца разумець творы традыцыйнай беларускай культуры.

Пазнавальны від дзейнасці пададзены ў нашай працы рознымі формамі работы. Да іх адносяцца знаёмства з каляндарнымі абрадамі, тэматычныя гутаркі і паведамленні па абраных тэмах, праца над эстэтычным успрыманнем народ-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ

ных песень, вывучэнне традыцыйнай народна-песеннай творчасці Беларусі, рэпетыцыйная работа па стварэнні абрадавых кампазіцый, знаёмства з танцавальна-гульнявым фальклорам.

Галоўная роля ў планаванні зместу пазнавальнага накірунку дзейнасці фальклорнага калектыву «Сунічкі» належыць знаёмству і засваенню канкрэтных этнічных ведаў па эстэтычнаму светаўспрыманню старажытных беларусаў: спачатку ўдакладняецца змест заняткаў і, у адпаведнасці з беларускім традыцыйным календаром, вызначаецца шэраг тэм, у межах якіх плануецца правядзенне выхаваўчай работы.

Асновай дзейнасці фальклорнага калектыву з'яўляецца яго песенны рэпертуар. Менавіта песня адлюстроўвае жыццё народа, яго эстэтычныя погляды, ідэалы. Таму мы выкарыстоўваем народныя спевы як эфектыўны, на наш погляд, шлях увядзення падлетка ў традыцыйную беларускую культуру.

Зразумела, што не толькі вызначэнне тэм, але і падбор рэпертуару гурту абумоўлены каляндарнай прымеркаванасцю. Напрыклад, працуючы над тэмай «Купалле», мы развучваем купальскія песні, а працуючы над тэмай «Агу, вясна», — веснавыя. Такі падыход дазваляе ўвесці дзяцей у свет фальклору як ў асаблівую этнакультурную прастору і садзейнічаць фарміраванню цэласных уяўленняў аб беларускім фальклоры.

Рэпертуар фальклорнага калектыву «Сунічкі» складаецца з твораў розных рэгіёнаў Беларусі. Нам уяўляецца неабходным працаваць над вывучэннем і засваеннем розных этнафанічных манер выканання народнай песні [3]. Для найбольш дакладнага ўзнаўлення і выканання песні мы выкарыстоўваем характэрны для фальклорнай культуры метад вуснага навучання (прынцып слыхавага ўспрыняцця), з голасу ці з аўдыёнасьбітаў, з паступовым «пераймannем і дакладным узнаўленнем усіх асаблівасцей моўнага і меладычнага тэксту, арнаментыкі» [4, с. 76]. Эмацыянальны вобраз народнай песні ствараецца не толькі словам і музыкай, але і ўсім аблiччам выканаўцы, тэмбрам яго голасу, манерай спеваў, што ў шмат разоў узмацняе эстэтычны ўплыў на ўспрымальніка.

Найчасцей мы выкарыстоўваем запісы, якія выпушчаны ў 80-я гады XX стагоддзя Ленінградскай студыяй грамзапісу «Мелодия»: «Народныя песні Беларускага Панямоння» (уклад. Т. Варфаламеева), «Народныя песні Цэнтральнай Беларусі» (уклад. Т. Варфаламеева), «Беларускі музычны фальклор» (уклад: З. Мажэйка, І. Назіна,Т. Варфаламеева), «Календарные песни Белорусского Полесья» (Пушкінскі дом), «Этнаграфічны ансамбль в. Ананчыцы Салігорскага раёна Мінскай вобласці», «Беларускі песенны фальклор. Паўночна-ўсходняя зона» (уклад. З. Мажэйка), «Традиционное искусство Поозерья. Обрядовая музыка», «Колендарные песні Белорусского Полесья». Сярод беларускіх CD-выданняў трэба адзначыць дыск «Аўтэнтычная музыка Беларусі: Каляды», часткі І, ІІ (уклад. Ю. Ф. Выдронак) студыі «Беларуская музычная альтэрнатыва» (2000). Такі спосаб навучання народным спевам спрыяе найбольшаму пагружэнню ў фальклорную культуру і аказвае пэўны выхаваўчы ўплыў на эстэтычную свядомасць падлеткаў.

Аднак у педагагічнай дзейнасці кіраўнік часта сутыкаецца з праблемай, вельмі знаёмай педагогам дзіцячых фальклорных калектываў, — неадэкватным эстэтычным успрыняццем народнай песні. Вядома, што асноўнымі ўмовамі развіцця здольнасці адэкватнага ўспрыняцця народнай песні, яе мастацкіх вобразаў з'яўляюцца эмацыянальная і музычная падрыхтоўка ўдзельніка, яго асабісты жыццёвы вопыт, мастацкі густ. Але ў фальклорны гурт не заўсёды прыходзяць дзеці з высокім узроўнем падрыхтоўкі. Трэба заўважыць, што многія сучасныя дзеці мала дзе чуюць народныя песні і яны не маюць адпаведных слыхавых уяўленняў. Звычайна іх цікавіць папулярная музыка, што часта негатыўна ўплывае на ўспрыманні народных песень. Вывучэнне розных праяў традыцыйнай беларускай культуры, святаў беларускага календара, міфалогіі, знаёмства з побытам старажытных беларусаў дапамагаюць дзецям наблізіцца да ўсведамлення мастацкіх вобразаў фальклору і пашырыць дыяпазон эстэтычнага ўспрымання народнай песні. Такім чынам, для вырашэння вызначанай праблемы намі былі вылучаны спецыяльныя заняткі для працы над эстэтычным успрыманнем народнай песні і правядзення тэматычных гутарак і паведамленняў *(табліца)*.

*Табліца*

**Тэматычныя гутаркі**

| Тэма | Гутарка |
|---|---|
| Пашлі Божа многа збожжа | Абрады жніва |
| Багач заткнуў у страху рагач | Паэтычныя погляды старажытных беларусаў на прыроду |
| Піліпаўскія ночкі прадуць сарочкі | Што рабілі на вячорках зімой (у Піліпаўскі пост)?<br>Легенды пра Цмока |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| Прыйшлі калядкі — бліны ды аладкі | Што такое Каляда? куцця? Чаму клікалі мароз падчас калядной куцці? |
| Гульні «Жаніцьба Цярэшкі», "Яшчур» | Карнавальны характар калядных гульняў. Што такое мастацкі вобраз і паэтычная метафара? |
| Масленіца-палізуха сыр і масла палізала | Маслянічны тыдзень. Чаму палілі чучала Масленіцы? |
| Агу, вясна | Абрад «Гуканне вясны». Шанаванне птушак у старажытнасці |
| Свята Вялічка — з чырвоным яічкам | Міфы пра стварэнне свету |
| Юр'е на двары — кароўку ў поле гані | Знаёмства з абрадам Юр'я. Жывёльны свет у міфалагічнай свядомасці нашых продкаў (казкі пра жывёл) |
| На граной ндзеле русалкі сядзелі | Русальны тыдзень. Водная стыхія ў міфалогіі Беларусі. Паданні пра русалак |
| Купалле | Купальскі абрад. Легенды пра папараць-кветку і пра кветку Іван-ды-Мар'я |
| Танцавальна-гульнявы фальклор | Шанаванне зямлі ў традыцыйнай культуры Беларусі |
| Калядныя канты | Святое Ражство радасць прынясло |
| На новае лета хай родзіцца жыта | Святы сонечнага крыжа |

Народная песня дазваляе паказаць падлеткам, што эстэтычнае пачуццё прыроды было заўсёды ўласціва людзям. Для нас вельмі важна, каб дзеці былі цалкам ахоплены прыгажосцю і велічнасцю песні, адлюстраваннем характва прыроды ў мастацкіх вобразах (у слове, гуку, інтанацыі). Успрыманне мастацкіх вобразаў народнай песні і іх эстэтычны аналіз дапамогуць падлеткам уявіць цудоўныя куточкі роднай прыроды, ацаніць сілу паэтычных метафар, запомніць найбольш выразныя эпітэты, узбагаціць сваю мову.

Звычайна эстэтычнае ўспрыманне народнай песні складаецца з трох этапаў: эмацыянальнага, аналітычнага, творчага. *Эмацыянальны этап* прадугледжвае пачуццёвае знаёмства з песняй. Для актывізацыі ўвагі дзяцей перад праслухоўваннем мы імкнёмся паставіць якое-небудзь праблемнае пытанне. Напрыклад: «Калі ласка, паспрабуйце вызначыць, калі выконвалася гэта песня — зімой, вясной, летам ці восенню? У час якога свята, на вашу думку, можа выконвацца гэта песня? Якія паэтычныя вобразы маюцца ў гэтай песні?»

Выразнае, каларытнае выкананне песні ў запісу ці яе выкананне педагогам заўсёды выклікае ў дзяцей эмацыянальны водгук, а пытанні стымулююць пазнавальны інтарэс і ўвагу ўдзельнікаў калектыву.

Першаснае эстэтычнае ўражанне кладзецца ў аснову аналізу твора на *аналітычным этапе*. Вядома, што механізм эстэтычнага ўздзеяння народнай песні грунтуецца на разуменні традыцыйных тэкстаў, ключавых слоў, веданне якіх залежыць ад ступені этнакультурнага развіцця ўдзельнікаў фальклорнага калектыву, ведання імі асноўных сэнсаў (тэзаўруса) традыцыйнай культуры. Разам з дзецьмі трэба прааналізаваць тэкст песні, звярнуць увагу на дыялектныя асаблівасці мовы, вызначыць месца песні ў каляндарным абрадзе. Напрыклад, аналізуючы тэкст купальскай песні «Шла Купалка па вуліцы» (вёска Ананчыцы Салігорскага раёна) дзеці адказвалі на наступныя пытанні: 1) Што ўяўляе сабой свята Купалле? 2) Чаму ў купальскую ноч трэба «пільнаваць» жыта? 3) Якія існуюць купальскія легенды?

Калі на першыя два пытанні дзеці адказвалі даволі актыўна (купальскія песні вывучалі раней), то на трэцяе яны нічога не адказалі. Такім чынам, неабходна пазнаёміць дзяцей са старажытнымі легендамі пра папараць-кветку і кветку Іван-ды-Мар'я.

Аналіз тэксту песні, знаёмства з легендамі і старажытнымі каляндарнымі абрадамі дапамагаюць выхаванцам эмацыянальна ўспрыняць фальклорныя творы, глыбока разумець іх эстэтычныя вобразы і сюжэты, таму што менавіта на падставе сінтэзу эмацыянальнага і рацыянальнага пашыраюцца веды дзяцей, яны становяцца больш цэласнымі і глыбокімі.

На *творчым этапе* дзеці займаюцца развучваннем песні, спалучаючы шматразовае праслухванне аўтэнтычнага выканання песні са спробамі ўласнага капіравання, і такім чынам удасканальваюць свае вакальныя ўменні і навыкі, дзякуючы чаму творы старажытнага мастацтва паступова становяцца больш даступнымі дзецям. У выхаванцаў з'яўляюцца свае ўласныя меркаванні, у якіх выяўляюцца не толькі эмоцыі, атрыманыя пры знаёмстве з песняй, але і глыбокія каштоўнасныя адносіны да фальклору. Такім чынам, дзеці вучацца бачыць, слухаць, выконваць і асэнсоўваць тое, што яны ўспрымаюць.

Разуменне сэнсу і сімволікі народных песень садзейнічае паступоваму павышэнню ўзроўня эстэтычнага ўспрымання не толькі фальклорных твораў, але і адлюстраваных у іх у вобразнай форме прыродных аб'ектаў. На наш погляд, праца над успры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маннем фальклорных твораў развівае творчую здольнасць дзяцей бачыць за мастацкімі вобразамі рэальныя аб'екты.

Выканальніцкая дзейнасць — гэта творчы працэс трансляцыі яскравай і самабытнай фальклорнай традыцыі — скарбу нацыянальнай культуры. Па гэтым накірунку намі прадугледжаны наступныя формы работы: наведванне розных мерапрыемстваў, удзел у канцэртах і конкурсах, пастаноўка музычных кампазіцый паводле каляндарных абрадаў, у тым ліку і ў прыродным ландшафце.

Вялікія магчымасці для фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды дае сама прырода. Аднак даследчыкі заўважаюць, што ў сучасным урбанізаваным свеце стасункі з прыродай зведзены да мінімума. Гэта праблема асабліва актуальна для гарадскіх дзяцей. Вядома, што эстэтычнае ўспрыманне прыроды не фарміруецца аўтаматычна, а дэфіцыт эмацыянальна-пачуццёвых прыродных уражанняў выліваецца ў непаўнавартасныя, спажывецкія адносіны да прыроды: яна не ўспрымаецца імі як значная эстэтычная каштоўнасць (А. Я. Герд, Д. М. Кайгародаў, Л. П. Печко, О. А. Паловіна, А. І. Самарцаў, І. Ф. Смальянінаў, І. В. Цвяткова, М. В. Шаптухоўскі і інш.). З вышэйсказанага можна зрабіць выснову аб неабходнасці педагагічнага кіраўніцтва, спецыяльнага выхаваўчага ўздзеяння на дзяцей.

На наш погляд, патрэбна, каб дзеці на ўласным вопыце адчулі прыгажосць прыроды, навучыліся яе бачыць. Для вырашэння гэтай задачы мы перыядычна, два-тры разы на год, удзельнічаем у традыцыйных каляндарна-абрадавых святах, якія праводзяцца ў натуральных прыродных умовах. Тым самым мы закладваем падмурак для ўзбагачэння эстэтычных уражанняў удзельнікаў калектыву, станаўлення іх каштоўнасных арыентацый і рыхтуем да будучых паводзін і кантактаў з прыродай. Напрыклад, мы прымаем удзел у каляндарна-абрадавых святах, якія праводзяцца Нацыянальным цэнтрам мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (сакавік 2007— 2009 гг. — Гуканне вясны, май 2007 г. — Зялёныя святкі).

Педагагічная функцыя адпраўлення каляндарных абрадаў заключаецца ў замацаванні традыцыі ў паводзінах чалавека праз сістэматычнае паўтарэнне пазітыўных эстэтычных стасункаў з прыродай. Эстэтычнае і педагагічнае ўздзеянне каляндарных абрадаў узмацняецца сукупнасцю розных відаў традыцыйнага мастацтва (спевы, танцы, гульні, карагоды). Удзел у каляндарных абрадах пашырае эстэтычную свядомасць выканаўцаў, «мацуе адчуванне задавальнення і абароненасці асобы, ладзіць энергетычны абмен з супольнасцю і прыродай» [1, с. 17]. У выніку актывізацыі эстэтычнай дзейнасці адбываецца ўсплёск радасных эмоцый і пачуццяў, якія потым пераносяцца і на іншыя віды дзейнасці, звязаныя з прыроднымі аб'ектамі, — вучэбную, працоўную, творчую.

Мастацка-практычная дзейнасць адносіцца да сферы стварэння ўзораў матэрыяльнай традыцыйнай культуры: выраб строяў, упрыгожванняў, атрыбутыкі, стварэнне прыгожага эстэтычнага асяроддзя. Прымаючы ўдзел у святах, дзяўчынкі плятуць вяночкі, вучацца падбіраць пацеркі і завязваць хусткі. Хлопчыкі часам займаюцца стварэннем касцюмаў калядных персанажаў.

Плануючы сацыяльна-культурную дзейнасць калектыву, мы выкарыстоўваем наступныя формы работы: экскурсіі да святых калодзежаў г. Мінска, у Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (в. Строчыцы), наведванне Батанічнага саду ў м. Варчыно (Польшча).

Падчас правядзення экскурсій неабходна імкнуцца да раскрыцця падлеткам магчымасцей эстэтычнага ўспрымання прыроднага свету, прывучаючы іх уважліва назіраць за асаблівасцямі пэўных аб'ектаў, характарызаваць іх эстэтычную каштоўнасць і значэнне для духоўнага самаадчування чалавека.

Такім чынам, дзейнасць дзіцячага фальклорнага калектыва «Сунічкі» пабудавана на спалучэнні магчымасцей зместу этнакультурнага выхавання з вывучэннем пазнавальнага матэрыялу, эстэтычнай накіраванасці ўспрымання і засваення мастацкіх твораў і пазнаннем гуманістычных і эстэтычных поглядаў нашых продкаў на прыроду. Усё гэта з'яўляецца базай для фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды і культуры адносін да яе як да эстэтычнай і грамадскай каштоўнасці.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. *Калацей, В. В.* Каранёвы светапогляд этнасу і этнаэкалагічны патэнцыял традыцыйнай культуры / В. В. Калацей // Традыцыйная культура і дзеці. Праблема этнавыхавання. — Вып. 2. — Матэрыялы III Рэсп. навук.-практ. канферэнцыі (19—20 красавіка 2006 г., г. п. Акцябрскі) / аўт. праекта і ўклад. М. А. Казенка. — Мінск : БелДІПК, 2006. — С. 16 — 19.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Москалёва, Э. Ф.* Формирование эстетического отношения младших школьников к окружающему миру: автореферат дис. ... канд. пед. наук / Э. Ф. Москалёва. — Ульяновск, 2007. — 23 с.

3. *Пладунова, Т. А.* Фарміраванне этнафанічных эталонаў гучання ў студэнтаў спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» БДУ культуры і мастацтваў / Т. А. Пладунова // Традыцыйная культура і дзеці. Праблема этнавыхавання. — Вып. 3. — Матэрыялы IV Рэсп. навук.-практ. канферэнцыі (2—3 красавіка 2008 г., г. п. Акцябрскі) / аўт. праекта і ўклад. М. А. Казенка. — Мінск : БелДІПК, 2008. — С. 104 — 116.

4. *Ражкова, Л. Л.* Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах: дыс. ... канд. пед. навук: 13. 00. 05. / Л. Л. Ражкова. — Мінск, 2007. — 132 с.

5. *Семёнова, М. О.* Технология етнокультурного виховання школярів / М. О. Семёнова // Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. конференції «Педагогічні та рекреаційні технології в сучасній індустрії дозвілля». — Київ : КНУКІМ, 2005 . — С. 241 — 248.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ